***Пекар А. С.**, настаўніца пачатковых класаў гімназіі № 1 г. Свіслачы Гродзенскай вобласці*

**Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа**

**Беларуская мова. III клас**

***Мэта:*** плануецца, што ў канцы ўрока вучні будуць мець уяўленні пра галоўныя члены сказа, будуць ведаць прыметы галоўных членаў сказа, умець знаходзіць іх у сказе.

***Задачы:***

- фарміраваць уяўленне пра галоўныя члены сказа, вучыць знаходзіць дзейнік і выказнік у сказе па сэнсавых пытаннях, па галоўных прыметах;
- садзейнічаць развіццю граматычнага ладу маўлення, лагічнага мыслення вучняў;
- выхоўваць працавітасць, сяброўскія адносіны паміж аднакласнікамі, любоў да прыроды, роднай краіны.

***Абсталяванне:*** вучэбны дапаможнік «Беларуская мова» (Свірыдзенка В. І., 2023), карткі з заданнямі, карткі з малюнкамі, камп'ютар для выканання тэсту

**І. Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

Цягнічок прыгожы, новы
Нас пытае: усе гатовы
Да ўрока роднай мовы?
Цягнічок за возам воз
Нас на станцыю прывёз.
Якую? Лясную!
Хто нас тут сустракае?
Вожык — раз, зайчык — два!
Павітацца нам пара.

**1. Моўная размінка.**



— Прывітанне. **В**ожык, зай**чы**к, во**ў**к, м**ядз**ведзь, нават п**ч**олка прыляцела з вам прывітацца.

— Пра каго так гавораць?Калючы, як…, працавітая, як…, баязлівы, як…, нязграбны, як…

— Будзем працаваць як?*(Як пчолкі.)*

Увага на правільнае вымаўленне гукаў у словах — назвах жывёл.

**II. Праверка дамашняга задання.**

— Пачнём урок з праверкі дамашняга задання.

— Якія знакі прыпынку ўставілі?

— Якія сказы вы запісалі?

— Дайце характарыстыку кожнаму сказу.

Тры вучні працуюць на картках (*дадатак 1*).

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

— Звернемся да нашых сяброў, якія прыехалі да нас на ўрок.

— Выдзеліце першы гук у слове пчолка. Якой літарай на пісьме абазначаем гэты гук?

**1. Адпрацоўка каліграфічных навыкаў, развіццё маўлення.**

— Прадоўжыце заканамернасць, акуратна запісваючы літары. Ацаніце правільнасць, акуратнасць, злучэнне і напісанне літар.

*Ппп, ППппп, ППП пппп*

*Прптртгпт*

*праца справа работа* ***гурт***

— Значэнне якіх слоў незразумела?

***Праца з тлумачальным слоўнікам.***

На экране — малюнкі.

гурт дзяцей



гурт авечак



— Запішыце гэтыя словы

— Што аб'ядноўвае гэтыя словы? *(Адказваюць на адно пытанне.)*

— Я жадаю вам сёння на ўроку і не толькі сёння працаваць, як пчолкі, тады ў нас усё атрымаецца. Запомніце: хто працуе, таму і шанцуе.

**2. Праца са слоўнікавым словам.**

***Гульня «Збяры слова».***

— Словы падзелены на склады, якія разляцеліся: **звi-нець**, па-зі-раць, **свя-ціць**.

— Якія з гэтых слоў слоўнікавыя?

— Што трэба памятаць, каб напісаць гэтыя словы без памылак?



— Што гэтыя словы абазначаюць?

— На якое пытанне адказваюць?

Настаўнік прад'яўляе вучням малюнак на тэму «Лес».

— Паглядзіце на лес, успомніце з урока літаратурнага чытання і скажыце: ці можа лес звінець?

— З апорай на вашыя адказы складзіце сказы са словам *звінець*.

— Са слоў складаем сказ і размяшчаем сказ на цягнік, які прыехаў у пачатку урока. Кожнае слова ў асобны вагон.

*Лес, рознымі, галасамі, весела, звініць.*




Словы *лес* і *звініць* размяшчаюцца ў чырвоныя вагончыкі.

— Дакажыце, што гэта сказ.

— Паспрабуйце схаваць слова *весела*.

— Ці парушыцца ад гэтага сэнс сказу?

— Не, атрымаецца сказ *Лес шуміць рознымі галасамі*.

— Схаваем слова *рознымі*, потым *галасамі*.

— Схаваем слова *лес*, што атрымаецца? Што звініць? Не ведаем. Гэта не сказ. Асноўная думка сказа: *лес звініць*.

— У кожным сказе ёсць больш важныя і менш важныя словы.

**IV. Матывацыйны этап.**

— Сёння мы з вамі навучымся бачыць і вызначаць больш важныя і менш важныя словы ў сказе, ставіць да іх пытанні. Даведаемся, якія словы ў сказе галоўныя, а якія — даданыя.

— Якія словы мы будзем лічыць галоўнымі? Даданымі?

**1. Складанне кластэра па тэме «Сказ».**

— Успомнім, што ведаем, дапоўнім, аб чым даведаемся.




По кластэры вучні робяць вынік, а потым пацвярджаюць гэта, чытаючы правіла ў падручніку.

***Праца з падручнікам у парах.***

***Прак. 112.***

Адзін вучань — настаўнік, другі — вучань. Адзін знаходзіць галоўныя члены сказа, другі правярае, потым наадварот.

Праверка: зачытваюць некалькі сказаў, называючы галоўныя члены сказа.

**V. Этап прымянення ведаў і ўменняў у практычнай дзейнасці.**

Запіс сказа пад дыктоўку.

*Курачка па зярнятку збірае і сытая бывае.*

— Знайдзіце дзейнік у сказе.

— Што гаворыцца пра курачку?

— Чаму так гавораць?

— Вучоба — ваша галоўная праца зараз. Калі вы з урока ў урок будзеце старанна дабываць веды, будзеце здабываць веды па маленькай крышачцы, то пры заканчэнні школы станеце адукаванымі маладымі людзьмі, перад якімі будуць адкрыць усе вучэбныя ўстановы нашай краіны. Старайцеся вучыцца, працаваць, рабіць усе магчымае, каб наша родная Беларусь працвітала.

***Фізхвілінкадынамічная.***

**VI. Замацаванне вывучанага.**

***Праца з падручнікам.***

***Прак. 115.***

— Дзейнік з’яўляецца сапраўдным героем. Ён сам выконвае дзеянні, сам дзейнічае. Магчыма, таму ён і называецца дзейнік. Паспрабуйце знайсці такога героя ў сказах. Самастойна выканайце заданне.

Узаемаправерка.

Індывідуальнае заданне з вучнямі, якім патрэбна дадатковая дапамога (*дадатак 2*).

Заданні для вучняў з высокім узроўнем матывацыі (*дадатак 3*).

Праверка.

**VI. Этап інфармавання аб дамашнім заданні.**

***Пр. 116***. Паўтарыце правіла на с. 70. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі і запішыце іх. Падкрэсліце ў кожным сказе галоўныя члены сказа.

**VII. Этап падвядзення вынікаў урока.**

Адзін вучань выконвае тэст за камп’ютарам. (ЕИОР — Беларуская мова. 3 клас. — Сказ. Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа.

***Гульня «Так ці не».***

*Інструкцыя*: Настаўнік зачытвае сцвярджэнні, звязаныя з тэмай урока. Калі вучні згаджаюцца са сцвярджэннем, падымаюць картку са знакам «+», калі не згаджаюцца — падымаюць картку са знакам «–».

Галоўныя члены сказа — дзейнік і выказнік. (+)

Дзейнік абазначае, што гаворыцца пра выказнік. (–)

Выказнік —ададзены член сказа. (–)

Выказнік абазначае, што гаворыцца пра дзейнік. (+)

Выказнік адказвае на пытанні *што рабіць?, што рабіў?*. (+)

Сказ *Дзеці хутка памірыліся* складаецца толькі з галоўных членаў сказа. (–)

***Падвядзенне вынікаў.***

— Працягніце выказванне:

*Я паўтарыў…*

*Я даведаўся…*

*Я ўмею…*

**VIII. Этап рэфлексіі.**

— Выберыце прыказку, якая апісвае вашу працу на ўроку:

Хто працуе, таму і шанцуе.

У адно вуха ўляцела, а ў другое вылецела.

Той не памыляецца, хто ад працы хіляецца.

*Дадатак 1*

**1. Выберы правільны адказ:** Сказ — гэта:

а) слова або некалькі слоў;

б) слова або некалькі слоў, якія выражаюць закончаную думку.

**2. Выберы апавядальны сказ:**

а) На траве заіскрылася раса.

б) Ці любіце вы збіраць грыбы?

в) Раскажы мне, бабуля, казку.

**3. Выберы сказ, у канцы якога трэба паставіць пытальнік:**

а) На лузе вырасла высокая трава

б) Давайце пойдзем у грыбы

в) Што без вады плавае

**4. Выберы сказы, у канцы якіх трэба паставіць клічнік:**

а) Як хораша ў бары

б) Чарнеюць суніцы на палянках

в) Як радасна пяюць птушкі

**5. Выберы патрэбны знак прыпынку ў канцы сказа:** *Сёлета выдалася сонечная восень*:

а) кропка;

б) пытальнік;

в) клічнік.

**6. Колькі сказаў у тэксце:** *На вясковай вуліцы зазвінелі дзіцячыя галасы радасныя вучні збіраліся каля школы сёння дзеці сядуць за школьныя парты*:

а) 3;

б) 4;

в) 5?

**7. Які гэты сказ па мэце выказвання:** *Ці любіце вы падарожнічаць?*

а) апавядальны;

б) пытальны;

в) пабуджальны.

**8. З якім выказваннем ты згодны?**

а) Клічнымі могуць быць толькі пабуджальныя сказы.

б) Клічнымі могуць быць апавядальныя, пабуджальныя, пытальныя сказы, калі вымаўляюцца з моцным пачуццём.

в) Апавядальныя сказы не могуць быць клічнымі.

*Дадатак 2*

**Знайсці і падкрэсліць у сказах дзейнік і выказнік. Звярнуць увагу на выдзеленыя арфаграмы.**

Ішла па лесе восень. Днём і ноччу шумеў у лесе залаты дождж. Дрэвы стаяць па калена ў лістах. Вераб’і ў лістах купаліся. У звярыныя норы цяклі залатыя ручайкі. Усе дрэвы адзелі восеньскі нарад.

*Дадатак 3*

**Запісаць сказы так, каб атрымаўся тэкст. Вызначыць сувязь слоў у сказах.Уставіць прапушчаныя літары, падкрэсліць граматычную аснову.Даць загаловак тэксту.**

Ве_ер, дз_муў, з, халодны, по_начы. Прыйшла восень. Звяры схаваліся ў за_ішак.